В системе Энергосбыта группа режимов, которая была организована в 1945 г., всегда играла важную роль. Планирование нагрузок и потребления электроэнергии, регулирование суточных графиков нагрузок предприятий, а в первые десятилетия после войны и республики в целом; разработка и осуществление контроля за выполнением графиков ограничений и отключений потребителей при дефиците мощности и энергии в энергосистеме, контроль за выполнением всех мероприятий, улучшающих режимы работы энергосистемы, – эти и другие вопросы всегда составляли главное содержание работы группы режимов.

На Минской ТЭЦ-2 в 1946 г. была организована первая мастерская по ремонту счетчиков. Сначала она не имела даже своего помещения, и работники занимались установкой и наладкой приборов учета на местах. 29 июля 1948 г. был введен в эксплуатацию стенд для проверки электросчетчиков. Ежедневный план предусматривал проверку 10 счетчиков. Начался регулярный ремонт приборов учета [1, с. 225].

Работа Энергоинспекции в первые годы после окончания войны в период восстановления народного хозяйства заключалась, в основном, в осуществлении надзора за техническим состоянием электроустановок, соблюдением потребителями элементарных правил и норм по электробезопасности и допуске в эксплуатацию новых электроустановок. Инспекция также занималась вопросами рационального использования электроэнергии на промышленных предприятиях, хотя в значительно меньшей степени, чем в последующие годы.

Разрушенная почти полностью промышленность республики находилась в стадии восстановления. Достаточно сказать, что отчеты о выполнении норм расхода электрической энергии за 1946 г. представляли всего 12 предприятий, размещенных на территории Минской, Витебской и Могилевской областей. Надзор за предприятиями Гомельской, Брестской и Гродненской областей Инспекция энергосбыта Белорусэнерго в то время не проводила.

Инспекция, являясь отделом Энергосбыта, осуществляла методическое руководство работой инспекций в отделениях Энергосбыта в Могилеве, Орше и Витебске.

**Список цитированных источников и литературы**

1. Белорусская энергетическая система. – Минск: ООО «Асар», 2001.
2. Национальный архив Республики Беларусь. – Фонд 125. – Оп. 3. – Д. 1.

## АБАРОНА БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ Ў ВЕРАСНІ 1939 г.

***Гарматны В.П.***
УО "Беларускі дзяржаўны універсітэт", г. Мінск

З 1921 па 1939 гг. у Брэсце-над-Бугам (так тады называўся Брэст), у крэпасці, якая згубіла сваё былое стратэгічнае значэнне, і навакольных фартах размяшчаліся тылавыя часткі IX акругі (DOC-IX) польскай арміі. Вясною 1939 г. у Брэсцкай крэпасці заставаліся маршавыя батальёны 82-га і 35-га пяхотных палкоў, воінскія падраздзяленні розных відаў войскаў і службаў, укамплектаваныя ў асноўным беларусамі. Разам з тым у крэпасці было досыць мабілізаваных рэзервістаў, якія ў асноўным паходзілі з Берасцейшчыны і Кобрыншчыны і чакалі адпраўкі ў армію [3, с. 14].

Вайна для жыхароў Брэста, як і для большасці грамадзян тагачаснай Польшчы, пачалася 1 верасня 1939 г. У гэты дзень нямецкая авіацыя бамбіла аэрадром Малашэвічы,

Брэсцкі вакзал, казармы 35-га і 82-га пяхотнага палкоў на Граеўцы. У далейшым горад і крэпасць неаднаразова падвяргаліся паветраным налётам, у выніку чаго з`явіліся першыя забітыя і параненыя, таму камандуючы акругай генерал Францішак Клебэрг прыняў рашэнне аб эвакуацыі з крэпасці сямей афіцэраў і вольнанаёмных [10, с. 10].

Салдаты-ўдзельнікі тых падзей успаміналі: "Ужо 1 верасня 1939 г. апоўдні 2 нямецкіх бамбардзіроўшчыкі бамбілі крэпасць. 2 верасня ізноў бамбілі. (Мы), знаходзячыся ў акопах, спрабавалі падбіць (самалёты), але былі абстраляны" [6, с. 10]. Брэсцкі павятовы староста Е. Хэйль 3 верасня паведамляў палескаму ваяводзе: "Дакладваю, што 2.09.1939 г. атрыманы наступныя паведамленні аб выніках налёту нямецкіх самалётаў... У 17 гадзін

7 нямецкіх самалётаў зрабілі налёт на крэпасць у Брэсце-над-Бугам, скінулі каля 10 бомб, пры гэтым былі пашкоджаны чыгуначнае палатно на Варшаўскім шляху, склад вопраткі, Белы палац; дзве бомбы трапілі на коней падчас працы камісіі па іх адбору. Ёсць забітыя і параненыя..." [3, с. 14].

7 верасня 1939 г. у Брэсце-над-Бугам спыніўся галоўнакамандуючы польскімі ўзброенымі сіламі і фактычны кіраўнік ІІ Рэчы Паспалітай маршал Эдвард Рыдз-Сміглы. аб гэтым стала вядома нямецкай разведцы. На горад быў здзейснены авіяналёт – бомбы рваліся ўсяго ў ста метрах ад гасцініцы, дзе пражываў маршал. Штаб хутка пераехаў у крэпасць, а 10 верасня маршал і яго падначаленыя пакінулі горад і рушылі на Валынь [2, с. 3]. З аўтакалонаю галоўнакамандуючага з Брэста і Малашэвіч з`ехала большая частка батарэі 9-га дывізіёна зенітнай артылерыі. У ноч з 12 на 13 верасня штаб генерала Клебэрга перадыслакаваўся ў раён Пінска.

11 верасня быў сфармаваны штаб групы, якая атрымала назву "Брэст", на якую ўсклалі заданне абароны подступаў да крэпасці, вонкавай лініі фартоў, а ў выпадку яго невыканання – падрыў мастоў і ўтрыманне 4-х асноўных умацаванняў. Адказнасць за выкананне гэтага задання лягла на камандуючага абаронай 49-гадовага адстаўнога брыгаднага генерала кавалерыі Канстанцы Плісоўскага, яго намесніка камандзіра пяхоты падпалкоўніка ў адстаўцы Юліана Сасабоўскага, начальніка штаба падпалкоўніка Алаіза Хорака, начальніка сувязі – капітана Ежы Ежыеўскага, камандзіра палявой артылерыі маёра Станіслава Камарніцкага, камандзіра зенітнай батарэі капітана Станіслава Малецкага. Гэты штаб напалову складаўся з афіцэраў запасу, сярод якіх былі інваліды Першай сусветнай вайны, няздатныя да нясення страявой службы [6, с. 10].

Камандны пункт падпалкоўніка Ю. Сасабоўскага знаходзіўся паміж Брэсцкай і Штабной-Брэсцкай брамамі. Камандуючы абаронай К. Плісоўскі і начальнік штаба падпалкоўнік А. Хорак ажыццяўлялі агульнае кіраўніцтва абаронаю крэпасці з жалезабетоннага сховішча ў Цытадэлі, дзе знаходзілася тэлефонная станцыя, якую абслугоўвалі сувязісты на чале з падпаручнікам запасу Браніславам Матэйка. Пазіцыі на фартэчных валах, а таксама розныя аб`екты ўнутры Цытадэлі занялі астатнія падраздзяленні [7, с. 272].

Групоўка "Брэст" складалася з маршавых батальёнаў 34-га, 35-га і 82-га пяхотных палкоў, 1-й роты маршавага батальёна 33-га палка. 81-га, 82-га вартавых, 56-га сапёрнага батальёна, 112-й і 113-й асобных танкавых рот, на ўзбранні якіх было па 15 старых французскіх машын "Рэно" FT-17, а таксама ўзвода танкетак TKS, 9-га аўтамабільнага дывізіёна, 49-га дывізіёна палявой артылерыі, 3-й зенітнай батарэі, вартавой роты, роты сувязі, асобных груп афіцэраў і салдат розных родаў войск і медыка-санітарнай службы. Сілы польскай абароны налічвалі ўсяго каля 4000 (па іншых дадзеных – 3150) салдат і афіцэраў – гэтага было безумоўна недастаткова, каб арганізаваць і забяспечыць абарону горада і ўсіх фартоў крэпасці, а таксама Цытадэлі.

У такіх умовах Плісоўскі прыняў рашэнне абараняцца толькі ў Цытадэлі і навакольных Кобрынскім і Цярэспальскім фартах [1, с. 85–86].

Менш чым праз два тыдні пасля пачатку вайны германа-польскі фронт апынуўся побач з Брэстам. З поўначы, прарваўшыся з Усходняй Прусіі, да горада імкліва набліжаўся 19-ты корпус 4-й германскай арміі пад камандаваннем генерала Гейнца Гудэрыяна ў складзе 3-й і 10-й танкавых, 2-й і 20-й матарызаваных дывізій [2, с. 8]. Немцы валодалі над палякамі значнаю перавагаю ва ўзбраенні і жывой сіле (у пяхоце – у 2 разы, у танках – у 4 разы, артылерыі – ў 6 разоў), што гарантавала ім поспех. Пры гэтым палякі нічога, акрамя старых валоў і казематаў, не маглі супрацьпаставіць агню нямецкай артылерыі і бамбардзіроўкам авіяцыі. Супраць 154 нямецкіх танкаў было паўтара дзесятка супрацьтанкавых ружжаў, 36 састарэлых танкаў і танкетак; супраць 260 гармат і мінамётаў – 18 палявых гармат і 8 зенітак.

13 верасня 1939 г. адбыліся першыя сутыкненні паміж абаронцамі і нямецкай разведкай. Каб скаваць сілы ворага, Плісоўскі выслаў насустрач два бронецягнікі капітанаў А. Падгурскага і М. Маліноўскага, а потым, прадбачачы вялікую верагоднасць таго, што немцы зоймуць Брэсцкі чыгуначны вакзал і перарэжуць чыгунку, накіраваў іх у бок Ковеля.

На наступны дзень 3-я танкавая дывізія генерала Гейера фон Швэпенбурга захапіла Жабінку, перарэзала чыгунку на Кобрын і Баранавічы, і ўступіла ў бой з патрулямі дывізіі “Кобрын”, 10-я танкавая дывізія генерала Штумпфа без бою захапіла Брэст і чыгуначны вакзал – заставалася толькі крэпасць [4, с. 118]. Першы націск быў адбіты агнём супрацьтанкавых ружжаў, артылерыі і 112-й танкавай роты паручніка Вацлава Стакляса. Спроба немцаў уварвацца ў Цытадэль магутнай танкаваю атакаю, выкарыстоўваючы фактар раптоўнасці, правалілася. Непераадольнаю заслонаю на шляху нямецкіх танкаў сталі састарэлыя “Рэно”, якія заблакіравалі Брэсцкую браму сваімі карпусамі і агнём. Дзеля падстрахоўкі ў 150 метрах ззаду знаходзілася пазіцыя батарэі зенітнай артылерыі паручніка Анджэя Блешынскага. Некалькі нямецкіх машын падарваліся на мінах, пяхота расстрэльвалася ва ўпор з добра замаскіраваных стралковых пазіцый [1, с. 87].

Вечарам некалькі дзесяткаў нямецкіх танкаў і пяхота пры падтрымцы артылерыі і авіяцыі атакавалі крэпасць з поўдня, аднак пасля чатырохгадзіннага бою былі вымушаны адступіць, страціўшы 7 машын. Каля 80 танкаў 8-га палка вялі жорсткі бой з 113-й танкавай ротай паручніка Ежы Астроўскага, якая трымала абарону на агародах Паўночнага вострава. У гэтым баі рота страціла ўсе машыны і перастала існаваць як самастойнае падраздзяленне. Яе рэшткі адыйшлі за валы, але і тут праціўнік быў спынены. Пасля гэтага Гудэрыян стаў рыхтавацца да планамернага штурму.

Пасля перагрупоўкі сіл Г. Гудэрыян арганізаваў масавы штурм па ўсіх вайсковых правілах: 10-я танкавая дывізія павінна наступаць уздоўж шашы Чарнаўчыцы-Брэст, 20-я матарызаваная – з усходняга і паўднёвага боку і завяршыць акружэнне крэпасці. Усю ноч нямецкая артылерыя абстрэльвала Брэсцкую крэпасць. У сваю чаргу палякі дзвюмя групамі дабраахвотнікаў зрабілі вылазку ў месца знаходжання праціўніка. Камандзір адной з гэтых груп падпаручнік Ежы Жаліхоўскі дакладваў начальству, што ім удалося знішчыць некалькі варожых танкаў і бронеаўтамабіляў [9, с. 11].

Ранкам 15 верасня пасля масіраванай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі часткі 10-й танкавай і 20-й матарызаванай дывізій пайшлі на штурм. Палякі аказвалі адчайны супраціў. Бой, які ў многіх месцах пераходзіў у рукапашную, працягваўся ўвесь дзень. Падчас агнявой падрыхтоўкі і паветраных налётаў абаронцы ўмацаванняў астаўлялі назіральнікаў і спускаліся ў казематы, а калі наступала цішыня, займалі

акопы і працягвалі бой. Прыступ быў адбіты. Параненых польскіх салдат санітары адносілі ў шпіталь, частку з іх праз Сапёрныя вароты і Авіяцыйны востраў потым здолелі эвакуяваць у Цярэспаль [8, с. 15].

Жорсткі бой працягваўся ўвесь дзень, пад вечар атака нямецкай пяхоты, нягледзячы на падтрымку артылерыі і авіяцыі, канчаткова спынілася. Нешматлікія падраздзяленні абаронцаў сталі для нямецкіх дывізій непераадольнаю заслонаю, а крэпасць – магутным бастыёнам. Немцы перайшлі да асады Цытадэлі, сістэматычна наносячы вялікія страты польскім пазіцыям, але абаронцы заставаліся на сваіх месцах [7, с. 273].

Каля 10 гадзін раніцы 16 верасня 1939 г. штурмавыя атрады 10-й танкавай і 20-й матарызаванай дывізій сіламі двух пяхотных батальёнаў пры падтрымцы танкаў і артылерыі павялі рашаючы наступ на лінію польскай абароны. Германская пяхота паднялася на грэбень валоў, але атака зноў захлябнулася. Для немцаў гэта была першая "сапраўдная" вайна, гарачка і мітусня рэальнага бою зламалі выдатна адпрацаваныя на вучэннях схемы: так, салдаты танкавай дывізіі не выканалі загад наступаць адразу за агнявым валам, а штурмавыя групы другой хвалі з запалам стралялі ў спіну сваім жа перадавым часткам. Асабліва жорсткая сутычка адбылася каля Брэсцкай брамы [3, с. 15]. Занепакоены Гудэрыян прыбыў на месца бою асабіста, але і ў яго прысутнасці пяхота не дабілася нічога і адступіла з вялікімі стратамі. Дакладным стрэлам польскага снайпера быў паранены ад`ютант камандуючага корпусам падпалкоўнік Браўбах, які праз некалькі дзён памёр [2, с. 8].

За два дні працяглых баёў толькі 69-ты полк 20-й нямецкай мотадывізіі згубіў 127 чалавек забітымі, 7 патанулымі і 237 параненых, аднак і становішча абаронцаў крэпасці станавілася безнадзейным. Групоўка "Брэст" была на мяжы знішчэння, страты забітымі і параненымі складалі каля 40%, заканчваліся боепрыпасы, не было дапамогі і сувязі, толькі 5 гармат заставаліся яшчэ прыдатнымі для вядзення бою. Генерал Плісоўскі атрымаў раненне ў плячо аскепкам гранаты, падпалкоўніка Хорака кантузіла, быў паранены маёр Камарніцкі. Гарэлі казармы, разбураны Белы палац і будынак Інжынернай управы, на асобных участках немцам удалося зачапіцца за крэпасныя валы і вымусіць польскія часткі адступіць у Цытадэль [8, с. 15].

На нарадзе камандзіраў было вырашана пакінуць крэпасць, каб захаваць людзей для далейшай барацьбы. Адзіны выхад з цытадэлі заставаўся па незанятым ворагам Цярэспальскім мосце на заходні бераг ракі Буг. У ноч з 16 на 17 верасня 1939 г. польскія войскі сталі пакідаць крэпасць. Праз Сапёрныя вароты выйшлі камандаванне і штаб абароны, маршавыя батальёны 34-га і 35-га палкоў, вартавыя батальёны, артылерысты, рота сувязі, абоз і машына з параненымі салдатамі і афіцэрамі [9, с. 11].

Сапёры 2-й роты пад камандаваннем падпаручніка Казіміра Гіаро, якія павінны былі аставіць баявыя пазіцыі апошнімі, знішчыць за сабою масты і замініраваць шлях, чакалі каля Штабной брамы падраздзяленні 82-маршавага батальёна, якія вялі бой у Кобрынскім умацаванні. Двое сувязных, пасланыя да камандзіра батальёна капітана В. Радзішэўскага з загадам адыходзіць, назад не вярнуліся. Потым высветлілася, што камандзір заявіў сваім падначаленым, што дазваляе ім адступіць, але сам застанецца змагацца. Салдаты вырашылі застацца і змагацца разам з камандзірам [2, с. 8].

Каля поўначы сапёры пры святле нямецкіх ракет пабачылі танкі і пяхоту, якія ішлі з поўначы да цытадэлі. Адначасова прыйшла вестка аб тым, што шлях на Цярэспаль перакрыты ворагам. Два ўзвода 2-й роты аказаліся адрэзанымі на Цэнтральным востраве. У гэтых абставінах паручнік Ян Палячэк прыняў рашэнне прарывацца праз нямецкія заслоны ў паўднёвым накірунку па правым баку Буга. Пакідаючы крэпасць, сапёры ўзарвалі адзін з мастоў разам з нямецкім танкам.

Невялікі атрад польскіх войскаў прайшоў праз Шпітальны востраў і Хелмскую браму і паспяхова выйшаў каля вёскі Страдзічы. Затым, пераправіўшыся праз Буг, сапёры далучыліся да адыходзячай на поўдзень групоўкі “Брэст”. Праз нямецкія пазіцыі здолеў прабіцца і капітан Радзішэўскі.

Частка абаронцаў крэпасці, ідучы ў напрамку Цярэспаля пад агнём нямецкай артылерыі, заблукала, натрапіла на ворага і была ўзята ў палон, але большасць палякаў здолела пакінуць Цытадэль і без вялікіх страт прыбыць у дамоўлены раён збору каля Кодня.

Ноччу з 16 на 17 верасня 1939 г. немцы перакінулі на левы бераг Буга 76-ты пяхотны полк 20-й мотадывізіі пад камандаваннем палкоўніка Голніка, плануючы наступ з заходняга напрамку [4, с. 119]. У цемры на шашы адбылося некалькі сутычак адступаючых палякаў з нямецкімі патрулямі. Загарэліся машыны 9-га польскага дывізіёна, загінулі многія параненыя і камандзір дывізіёна маёр Уладзіслаў Яскульскі.

У сваіх мемуарах Гудэрыян пісаў, што немцы ўвайшлі ў крэпасць адразу за палякамі, але гэта было не так. Усю ноч на пустую крэпасць працягвалі падаць снарады і толькі ў першай палове дня 17 верасня праз Авіяцыйны востраў у Цытадэль уварваўся 76-ты пяхотны полк немцаў, а з боку горада ў крэпасць увайшлі часткі 20-й матарызаванай дывізіі.

Страты абодвух бакоў у гэтых баях дакладна падлічыць немагчыма. Адразу пасля штурму крэпасці было пахавана некалькі соцень забітых немцаў. Да вясны 1941 г. у Брэсце дзейнічала спецыяльная нямецкая камісія, якая займалася адпраўкаю рэштак сваіх салдатаў у Германію. У палон у раёне крэпасці трапіла 980 польскіх салдат і 8 афіцэраў, у асноўным параненыя. Шмат цяжкапараненых і кантужаных прыйшлося пакінуць у шпіталі. Разам з імі да канца былі ўрачы-афіцэры, санітары і медсёстры на чале з капітанам Феліксам Драганам [7, с. 275].

Праз некалькі дзён у Брэст увайшлі часткі Чырвонай Арміі пад камандаваннем камбрыга Сямёна Крывашэіна, і 22 верасня 1939 г. адбыўся сумесны парад нямецкіх і савецкіх войск. У сяброўскай размове з камбрыгам Гудэрыян некалькі разоў згадаў, што пад Брэстам яго корпус панёс вялікія страты. Генерал не перабольшваў, страты былі сапраўды вельмі вялікімі. Да адводу войскаў за дэмаркацыйную лінію немцы нават не паспелі эвакуяваць сваіх параненых і падабраць пашкоджаныя танкі.

На гэтым не скончылася гераічная абарона Брэсцкай крэпасці польскімі войскамі ў верасні 1939 г. Ноччу 17 верасня мужны капітан Радзішэўскі разам з ацалелымі салдатамі свайго батальёна і адною гарматаю вярнуўся ў крэпасць і ізноў заняў абарону ў форце Сікорскага. Двое сутак немцы займаліся прыборкай крэпасці і не звярталі ўвагі на форт, які лічылі пустым.

19 верасня з`явіўся матацыклетны патруль з парламентарыямі, якія прапанавалі палякам здацца ў сувязі з бессэнсоўнасцю далейшага супраціву, але іх прапанова не была прынята. Германскія салдаты блакіравалі форт, усталявалі некалькі гаўбіц і з раніцы 20 верасня пачалі сістэмны абстрэл умацаванняў, аднак артылерыйскі агонь фугаснымі снарадамі сярэдняга калібра не мог нанесці польскаму гарнізону якіх-небудзь сур`ёзных страт, а пяхота форт не атакавала. Форт знаходзіўся на добра прагляданай і абстрэльваемай з высокіх валоў мясцовасці. Генерал Гудэрыян вырашыў перадаць гэтую “стрэмку” рускім.

Вечарам 22 верасня пасля магутнага артылерыйскага налёту ў форт паспрабавалі прарвацца два савецкіх бронеаўтамабіля. Першы з іх палякі падпалілі стрэлам з гарматы, другі зваліўся ў роў. Затым у атаку тройчы падымалася савецкая пяхота і кожны раз несла вялікія страты. 23 верасня “саюзнікі” былі заняты пераходам Брэста і

крэпасці пад савецкую ўладу, але 24-га і 25-га з розных бакоў ізноў безвынікова паспрабавалі авалодаць фортам. Нарэшце, 26 верасня савецкія военачальнікі падцягнулі цяжкую артылерыю і пачалі масіраваны штурм, падчас якога абодва бакі панеслі вялікія страты, але форт застаўся ў руках палякаў.

Усе рэсурсы для абароны форта былі вычарпаны, таму В. Радзішэўскі сабраў апошніх абаронцаў форта, падзякаваў ім за службу і параіў усім, хто можа ісці, дабірацца дадому (згодна польскім крыніцам, азвярэлыя чырвонаармейцы закалолі штыкамі застаўшыхся ў форце параненых разам з урачамі і мядсёстрамі). Радзішэўскі і астатнія салдаты дайшлі да вёскі Мухавец, дзе ў хаце мясцовай жыхаркі пераапрануліся ў грамадзянскую вопратку, аставілі дакументы і разыйшліся ў розныя бакі. Радзішэўскі накіраваўся ў Брэст, а потым у Кобрын, дзе павінна была знаходзіцца яго сям`я. Ён знайшоў жонку і дачку, але хутка з-за даносу быў арыштаваны, перададзены НКУС і зноў трапіў у Брэсцкую крэпасць, на гэты раз у “Брыгіткі”, дзе сядзелі польскія афіцэры.

Пакідаючы Брэст, немцы перадалі ўсіх палонных палякаў, сярод якіх былі і абаронцы крэпасці, савецкаму камандаванню. Пасля сарціроўкі большасць радавых, у першую чаргу ўраджэнцаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, адпусцілі па хатах. Афіцэраў, паліцэйскіх, жандараў і параненых аддзялілі ад медперсаналу, і на працягу кастрычніка-лістапада 1939 г. пад канвоем дастаўлялі на чыгунку і адпраўлялі на Смаленшчыну ў Катынскія лагеры, дзе большасць з іх загінула. Сярод іх быў і герой абароны Брэсцкай крэпасці Вацлаў Радзішэўскі [1, с. 89, 91–92].

А што здарылася з іншымі абаронцамі Брэсцкай крэпасці? Адразу пасля прарыву К. Плісоўскі перадаў камандаванне над ацалелымі ўдзельнікамі абароны Брэсцкай крэпасці (іх заставалася каля 2000 чалавек) Алаізію Хораку, а сам выехаў у Луцк, дзе прыняў кавалерыйскую брыгаду. Пазней ён трапіў у савецкі палон і быў інтэрнаваны ў Страбельскі лагер. Хутчэй за ўсё, генерал таксама загінуў ад рук НКУС.

Хорак далучыў да сваёй групоўкі рэшткі іншых разбітых польскіх аддзелаў і працягваў змаганне. Каля 2 000 салдат і афіцэраў групоўкі “Брэст” на чале з падпалкоўнікам вялі барацьбу спачатку з немцамі, а потым і з Чырвонай Арміяй з 18 верасня па 1 кастрычніка 1939 г. на поўдні Люблінщчыны [7, с. 275]. Пасля паражэння Польшчы падпалкоўнік перайшоў на нелегальнае становішча, узначаліў Варшаўскую акругу Саюза Узброенай барацьбы, а потым быў арыштаваны гітлераўцамі і расстраляны ў лютым 1943 г. Далейшы лёс большасці радавых абаронцаў Брэсцкай крэпасці пасля верасня 1939 г. невядомы.

Вызначыць дакладна колькасць страт польскіх і нямецкіх войскаў у баях за крэпасць немагчыма. Польскія афіцэры высока адзначалі гераізм беларускіх салдат, напрыклад, салдат маршавага батальёна 82-га пяхотнага палка, якія трымалі абарону у 5-ым форце, а таксама шэрагоўцаў 35-га пяхотнага і 30-га лёгка-артылерыйскага палка. Сярод найбольш вызначыўшыхся жаўнераў-беларусаў, абаронцаў Брэсцкай крэпасці ў верасні 1939 г., трэба адзначыць Дзмітрыя Іванчука, Мікалая Зубовіча, Рыгора Ігнатовіча, Рыгора Ляўчука, Сцяпана Раюка і іншых [5, с. 174-175].

У савецкі час звесткі аб гераічных падзеях у Брэсцкай крэпасці ў верасні 1939 г. упарта замоўчваліся, і толькі з мемуараў Г. Гудэрыяна, выдадзеных на Захадзе, можна было даведацца пра мужны супраціў абаронцаў крэпасці. Толькі пасля развалу СССР стала магчымым у 1994 г. адкрыццё экспазіцыі, прысвечанай вераснёўскім падзеям, удалося аднавіць гераічную старонку пачатку Другой сусветнай вайны.

У 2000 годзе на Брэсцкіх гарнізонных могілках, дзе пахавана частка абаронцаў крэпасці, якія загінулі падчас “вераснёўскай кампаніі”, адбылося ўрачыстае адкрыццё

помніка са словамі: "Памяці салдат Войска Польскага Брэсцкага гарнізона ў 1921–1939 гг. і абаронцаў Брэсцкай крэпасці, якія загінулі ў верасні 1939 г., пахаваных на гэтых могілках. Суайчыннікі 2000".

Такім чынам, у верасні 1939 г. беларусы ўпершыню сутыкнуліся з нацысцкай агрэсіяй і разам з палякамі і ўкраінцамі паспяхова ёй супрацьстаялі. З 13 па 17 верасня 1939 г. абаронцы Брэсцкай крэпасці ўпарта стрымлівалі націск 19-га танкавага корпуса на чале з вядомым і таленавітым генералам Г. Гудэрыянам. Польскія часткі адбілі сем нямецкіх атак, якія нярэдка заканчваліся ўрукапашную. Памяць аб тых гераічных днях назаўсёды застанецца ў сэрцы беларускага, польскага і ўкраінскага народаў.

**Список цитированных источников и литературы**


1. Бешанов, В.В. Брестская крепость / В.В. Бешанов. – Минск, Беларусь, 2004. – 158 с.
2. Бешанов, В. Горячий сентябрь цитадели / В. Бешанов // Брестский курьер. – 2005. – сентябрь, № 38. – С. 8-9.
3. Брестская крепость: страницы истории / сост. А.П. Кондак [и др.] – Брест: Брестский горисполком, 2000. – 28 с.
4. Галимова, Н.П. Участие воинов-белорусов в обороне Брестской крепости в сентябре 1939 г. / Н.П. Галимова // Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і лёсы народаў Усходняй Еўропы: матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі (Мінск, 16-17 сакавіка 2001 г.). – Мінск, БДУ, 2001 – 210 с. – С. 115-119.
5. Грыбоўскі, Ю. Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фарміраваннях 1918-1945 гадоў / Ю. Грыбоўскі. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2006. – 832 с.
6. Митюкова, Е. Боевое крещение Брестской крепости / Е. Митюкова // Заря (г. Брест). – 2006. – 15 июля. – С. 10.
7. Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка. Брэст: у 2 кн. – Мінск: БелТА, 1997. – Кн. 1. – 576 с.
8. Суворов, А. Брестская крепость: когда был первый бой – 22 июня 41-го? Нет, гораздо раньше / А. Суворов // Литературная газета. – 1989. – 20 сентября. – С. 15.
9. Kublicka, L. Pierwsi bronili Polacy / L. Kublicka // Glos znad Niemna. – 2000. – 19 czerwca. – S. 11.
10. Popiel, Z. Moj wrzesien / Z. Popiel // Glos znad Niemna. – 2002. – 6 wrzesnia. – S. 10.


## БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ Ў ПАРТЫЗАНСКІХ ФАРМІРАВАННЯХ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ ПАДЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ


*Грыбава С.У.*

УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт», г. Брэст


Партызанскі рух у нашай краіне, як і на ўсёй тэрыторыі СССР, насіў усенародны, інтэрнацыянальны характар. Прадстаўнікі больш 70-ці нацыянальнасцей змагаліся ў шэрагах партызан на Беларусі. Унеслі свой уклад у агульную перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі і беларускія татары. Артыкул прысвечаны ўдзелу ў партызанскім руху дадзенай нацыянальнай меншасці ў складзе партызанскіх фарміраванняў Мінскай вобласці (па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу на 1.01.1941 г.). Артыкул у асноўным грунтуецца на матэрыялах Нацыянальнага архіва РБ (у працэсе яго падрыхтоўкі былі вывучаны архіўныя крыніцы 37 партызанскіх брыгад і асобных атрадаў). У ім прыводзіцца шэраг найбольш характэрных прыкладаў дзейнасці татар, ураджэнцаў Беларусі, у партызанскіх злучэннях Мінскай вобласці.